Источник: "Краязнаўчая газета" - 2012-09-27

# На тым тыдні...

✓ **17 верасня** ў Мінску адбылося **ўскладанне кветак да мемарыяльнай дошкі на доме па вуліцы Кульман, 15**, дзе жыў народны паэт Беларусі Максім Танк.

✓ **17 верасня** ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі прайшла **прэзентацыя навуковага выдання А.Л. Вераб'я «Максім Танк і польская літаратура»** (выдавецтва «Беларуская навука»). У манаграфіі разглядаюцца традыцыі польскага рамантызму XIX ст. у паэзіі класіка, даследуюцца ўзаемаадносіны творчасці беларускага паэта з польскай літаратурай XX ст., аналізуюцца пераклады паэта на польскую мову, даецца ацэнка працам польскіх крытыкаў і літаратуразнаўцаў, прысвечаных яго творчасці.

На вечарыну былі запрошаны навукоўцы НАН Беларусі, выкладчыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Беларускага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, прадстаўнікі Польскага Інстытута ў Мінску і інш. Да імпрэзы была падрыхтавана **выстаўка «Максім Танк – волат паэтычнага свету»**.

✓ **17 верасня** ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа была **адкрытая выстаўка «... Я заўжды помню голас твой»**, падрыхтаваная да 100-годдзя з дня нараджэння Максіма Танка з фондавых матэрыялаў. На выстаўцы прадстаўлены кнігі паэта з дарчымі надпісамі Якубу Коласу, вершы-прысвячэнні Коласу, фотаздымкі, дзе адлюстраваны сумесная паездка ў Ленінград, адпачынак на Нарачы і інш.

У адкрыцці выстаўкі прынялі ўдзел галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура» паэт Віктар Шніп, доктар тэхнічных навук, сын Якуба Коласа Міхась Міцкевіч.

✓ **18 верасня** ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва адбылося **адкрыццё праекта «Калекцыя экслібрыса»**, прысвечанага 15-годдзю музея. Пад час адкрыцця прайшла прэзентацыя каталога «EX LIBRIS калекцыя», выдадзенага пры падтрымцы Польскага Інстытута ў Мінску і кнігарні «Кніжны салон». Выстаўка створаная дзякуючы данацыям мастакоў з 34 краінаў. Сёння музейную калекцыю экслібрыса складаюць больш за 1 700 эстампаў.

Праект – спроба зрабіць рэтраспектыўны зрэз беларускага экслібрыса ў міжнародным кантэксце праз працы найбольш актыўных беларускіх графікаў-экслібрыстаў старэйшага і малодшага пакаленняў.

Выстаўка міжнароднага экслібрыса працягнецца да 29 верасня, а экспазіцыя беларускага экслібрыса – да 6 кастрычніка.

✓ **18 верасня** ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры прайшла **прэзентацыя кнігі «Максім Танк. На камні, жалезе і золаце»** (успаміны, эсэ, прысвячэнні), выхад якой прымеркаваны да юбілею народнага паэта. На імпрэзе прагучалі ўспаміны вядомых паэтаў, даследчыкаў творчасці Максіма Танка, а таксама тых, хто спрычыніўся да выдання кнігі.

✓ **19 верасня** ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі адбылася **прэзентацыя кнігі «Академик Пётр Прохоренко»** (выдавецтва «Чатыры чвэрці»), прысвечанай выбітнаму акадэміку. У выданні прадстаўленыя старонкі з яго дзённіка, лісты, артыкулы, тэксты выступаў. Да мерапрыемства была падрыхтаваная **выстаўка «Жизнь в науке. Памяти учёного П.П. Прохоренко»**.

✓ **20 верасня** Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы запрасіў на **літаратурна-музычную вечарыну «Я сэрцам пісаў сваю кожную песню...»**, прымеркаваную да 100-годдзя з дня нараджэння Максіма Танка. У ёй прымалі ўдзел Віка Трэнас, Т. Барысюк, Д. Лосева, М. Кандратаў, удзельнікі літаратурнага гуртка «Альтанка» пры філалагічным факультэце БДУ; студэнты Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі і вучні музычнай школы № 10 выконвалі класічную і нацыянальную інструментальную музыку.

"Краязнаўчая газета". На тым тыдні…